НЕ 1140
I-б. "Савецкая Беларусь" Москва, Моховая, 3 Публичная библиотека СССР им. Ленина отд. обмен. адвін экз.
ПУБЛИЧНАЯ БИБЛИОТЕКА

Пролетарыі ўсіх кр... Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się! ...всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

НЯДЗЕЛЯ
22 лістапада 1931 г.
№ 269 (3358)

Вышэй сьцяг сацспаборніцтва!

Менск прыняў выклік Віцебску. Два буйнейшых прамысловых цэнтры БССР уступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва за ганаровае месца ў „Чырвонай кнізе сацыялістычных рапартоў".

У сваёй адозьве, якую мысёньня падаем, **гарадзкі камітэт КП(б)Б Менгарсавет, гарпрафсавет і гаркам камсамолу адзначаюць, што**

„Ход перабудовы работы саветаў тварам да саўгаснага і калгаснага будаўніцтва, уключэньне саветаў, дэпутацкіх груп і сэкцый гарсавету ў сацыялістычнае спаборніцтва за ганаровае месца ў „Чырвонай кнізе сацыялістычных рапартоў саветаў" застаецца яўна нездавальняючым".

Да гэтага часу большасьць дэпутацкіх груп г. Менску не працуе. Парткалектывы менскіх заводаў недаацэньваюць усёй важнасьці ажыўленьня работы дэпутацкіх груп. Мы пісалі ўжо аб апартуністычных адносінах да савецкай работы сакратара парткалектыву завода Імя Варашылава тав. Хаскіна, нажаль ён не адзіны: фабрычна-заводзкія арганізацыі ДО, абутковая фабрыка, „Камунарка" і інш. ня лепш адносяцца да гэтай важнейшай работы.

Нарада брыгад, прымацаваных да дэпутацкіх груп гор. Менску, якая адбылася пры рэдакцыі, цалкам гэта пацьвярджае.

Так, высьветлілася, што дэпутацкая група заводу імя Варашылава не разгарнула сваёй работы **Старшыня дэпутацкай групы** лічыць, што работу дэпутацкай групы трэба пачаць толькі пасьля перавыбараў фабзаўкому?! Так-жа сама адносіцца да гэтай работы бюро камсамольскага калектыву. Яго сакратар так і заявіў брыгадзе: **„У нас зараз ёсьць справы больш важныя".**

Ня лепш адносяцца да работы дэпутацкай групы і фабрычна-заводзкія арганізацыі фабр. **„Беларуска"** і завод **ДО**. Гэтыя прадпрыемствы заслугоўваюць асаблівай увагі грамадзкасьці, гарадзкога савету і гарадзкога камітэту партыі. Патрэбна самым рашучым чынам ударыць па тых, хто недаацэньвае работы дэпутацкіх груп, зрывае іх работу. Патрэбна неадкладна аслабаніць старшынь бюро дэпутацкіх груп ад іншай нагрузкі, лічачы гэту нагрузку асноўнай і для партыйца і для беспартыйнага. Патрэбна зьмяніць непрацаздольных старшынь бюро, замяніць іх лепшымі ўдарнікамі, дэпутатамі гарсавету

Пералом у гэтай рабоце павінен быць дасягнуты на працягу бліжэйшых дзён.

У сваёй адозьве гарком КП(б)Б гарсавет, гарпрафсавет і гарком комсамолу прапануюць усім сэкцыям і дэпутацкім групам **на працягу дэкады** распрацаваць канкрэтныя абавязацельствы па сацыялістычным спаборніцтве за месца ў „Чырвонай кнізе саветаў", шырока абгаварыць і вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы па ажыцьцяўленьні ліста ЦК, ЦКК КП(б)Б і ЦСПСБ ад 9-X—31 г. „аб мерах прыцягненьня шырокіх працоўных мас у савецкі апарат".

Патрэбна мабілізаваць увесь актыў, усю пралетарскую грамадзкасьць на ўдарнае правядзеньне ў жыцьцё прынятых сельсаветамі сэкцыямі і дэпутацкімі групамі абавязацельстваў, абвясьціўшы масавы прыліў добраахвотнікаў для работы ў сэкцыях і дэпутацкіх групах.

Адозва заклікае арганізаваць штурмавыя брыгады і змагацца за ганаровае месца ў „Чырвонай кнізе саветаў", арганізаваць чырвоныя абозы збожжа, лёнасемя і лёна-валакна імя газ. „Савецкая Беларусь".

Адозва вызначае пэўныя шляхі ажыцьцяўленьня Меншчынай узятых на сябе абавязацельстваў, вызначае шляхі перамогі ў спаборніцтве за месца ў „Чырвонай кнізе саветаў". Задача ўсёй партарганізацыі Менску і яго раёну давесьці гэтую адозву да кожнага рабочага, калгасьніка, бедняка—серадняка - аднаасобніка. Гэтая адозва павінна зрабіцца здабыткам шырокіх працоўных мас.

Цэнтральны, раённы і нізавы друк павінен прыняць самы актыўны ўдзел у правядзеньні кампаніі „Чырвонай кнігі". Конкурс „Правды", у правядзеньне якога ўключылася „Савецкая Беларусь", павінен мабілізаваць друк і ўсю рабселькораўскую армію на бальшавіцкае выкананьне чарговых задач партыі і ўраду. Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў зьяўляецца адной з асноўных задач і нізавога друку і саветаў. Вось чаму „Савецкая Беларусь", уключаючыся „Чырвонай кнігай" у конкурс „Правды", бярэ на сябе канкрэтны абавязак—выявіць лепшыя ўзоры барацьбы друку і рабселькораў за выкананьне задач, пастаўленых конкурсам „Правды" даць месца лепшаму досьвыту барацьбы друку ў „Чырвонай кнізе сацыялістычных рапартоў", прэмяваць лепшыя газэты і рабселькораў з фонду „Чырвонай кнігі" разам з лепшымі саветамі, сэкцыямі і дэпутацкімі групамі.

Патрэбна рашуча дамагчыся поўнага правядзеньня ў жыцьцё ўзятых на сябе абавязацельстваў. праграмы—мінімуму. Дамагчыся права аб дасягнутых посьпехах ва ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва рапартаваць партыі і ўраду на працягу лістапада і сьнежня.

Гэтага можна і трэба дамагчыся пры шырокай мабілізацыі мас, пры чоткай, канкрэтнай рабоце.

Па прыкладзе **фінансавай сэкцыі Менгарсавету** належыць разьмеркаваць свае абавязкі такім чынам, каб цалкам ліквідаваць тую абязьлічку, якая існавала і існуе яшчэ і зараз у шмат якіх сэкцыях і дэпутацкіх групах БССР.

Адозва гаркому партыі, гарсавету, гарпрафсавету і гаркому ЛКСМБ зьяўляецца надзвычайна важным дакумантам, на яе правядзеньне ў жыцьцё павінна быць зьвернута ўвага ўсёй савецкай грамадзкасьці.

За „Чырвоную кнігу саветаў"

За бальшавіцкія, канкрэтныя справы

ПАВІННЫ ЗМАГАЦЦА САВЕТЫ, УСТУПІЎШЫЯ у сацспаборніцтва за месца ў „Чырвонай кнізе"

Зварот Менскага гарадзкога камітэту КП(б)Б гарсавету, ГСПС, камсамолу — да ўсіх шырокіх мас, апрацаваць у кожнай давесьці ячэйцы, заўкоме і дэпутацкай групе

Узяць сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы

Усім партыйным, камсамольскім, савецкім, прафсаюзным арганізацыям гораду Менску і яго раёну

Ход перабудовы работы саветаў тварам да вытворчасьці саўгаснага і калгаснага будаўніцтва, уключэньне саветаў, дэпутацкіх груп і сэкцый Гарсавету ў сацыялістычнае спаборніцтва за ганаровае месца ў «Чырвонай Кнізе сацыялістычных рапартоў Саветаў» застаецца яўна нездавальняючым. Цэлы шэраг сельсаветаў і прадпрыемстваў яшчэ да гэтага часу зусім ня ўключыўся ў практычнае правядзеньне гэтай важнейшай палітычнай кампаніі і ня прыняў належных мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьні пастановы ЦК УсеКП(б) і дырэктыўнага ліста ЦК, ЦКК КП(б)Б і ЦСПСБ ад 9-X-31 г. аб шэфстве прадпрыемстваў над савецкімі ўстановамі.

Надаючы гэтай кампаніі вялізарнейшае значэньне ў сэнсе выкананьня рашэньняў партыі і Ураду аб рашучай перабудове работы Саветаў у адпаведнасьці з задачамі пасьпяховага выкананьня колькасных і якасных паказчыкаў прамфінпляну 3-га рашаючага году пяцігодкі, арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня колгасаў, і на гэтай аснове далейшае калектывізацыі с-г і правядзеньня ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній (нарыхтоўкі, мабілізацыя сродак і інш.), Менскі Гарадзкі Камітэт КП(б)Б і ЛКСМБ, Гарсавет, Гарпрафсавет прапануюць:

1. Арганізаваць на працягу дэкады, там дзе яшчэ гэта не праведзена, масавы агляд работы саветаў, сэкцый і дэпутацкіх груп, распрацаваць канкрэтныя абавязацельства сельсаветаў, сэкцый і дэпутацкіх груп па сацыялістычным спаборніцтве за месца ў «Чырвонай Кнізе».

2. Шырока абгаварыць і вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы па ажыцьцяўленьні ліста ЦК; ЦКК КП(б)Б і ЦСПСБ ад 9-X-31 г. «Аб мерах прыцягненьня шырокіх рабочых мас у савецкі апарат».

3. Мабілізаваць увесь актыў, усю пралетарскую грамадзкасьць і шырокія масы рабочых, служачых, інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу, настаўніцтва, студэнцтва і калгасьнікаў на ўдарнае правядзеньне ў жыцьцё ўсіх прынятых сельсаветамі, сэкцыямі і дэпутацкімі групамі абавязацельстваў, абвясьціўшы масавы прыток добраахвотнікаў для работы ў сэкцыях і дэпутацкіх групах, па-за штатнымі інструктарамі сэкцый, дэпутацкіх груп і савецкіх устаноў.

4. Узяць пад неаслабны грамадзкі кантроль ход перабудовы работы саветаў, выкананьне пастаноў партыі і ўраду, наказу выбаршчыкаў, і ўсю работу с-с сэкцый і дэпутацкіх груп і кожнага з членаў Савета, сэкцый і дэпутацкіх груп, наладзіўшы сталае сыстэматычнае асьвятленьне гэтага ў насьценгазэтах, шматтыражках і цэнтральным друку.

5. Узяць сапраўды ўдарныя бальшавіцкія тэмпы перабудовы работы саветаў, адпаведна задачам рэканструкцыйнага мэтаду. Уключыцца ў сацыялістычнае спаборніцтва, узяць на сябе канкрэтна абавязацельства, выдзяліць штурмавыя брыгады і змагацца за ганаровае месца ў «Чырвонай кнізе Саветаў» пад лёзунгамі:

а) выкананьне і перавыкананьне колькасных і якасных паказчыкаў прамфінпляну 3-га рашаючага году 5-ці годкі, бальшавіцкага правядзеньня асеньня-зімовых перавозак, поўнага ажыцьцяўленьня 6 умоў правадыра партыі тав. Сталіна.

б) ганаровае месца ў «Чырвонай кнізе», чотка праводзячы генэральную лінію партыі. Поўнасьцю выканаем пляны загатовак, бездакладна спагонім з заможна-кулацкіх гаспадарак цьвёрдыя заданьні па загатоўках, падатак, страхоўку і самаабкладаньне.

в) На стварэньне «Чырвонай кнігі» аднажам масавай арганізацыяй чырвоных абозаў са збожжам, лёна-насеньнем і лёна-валакном. Ні воднага саўгаса, калгаса і аднаасобніка не ўдзельнічаючага ў чырвоных абозах імя газэты «Савецкай Беларусі» ініцыятара «Чырвонай кнігі».

г) Займем месца ў „Чырвонай кнізе"

поўным выкананьнем заданьняў па мабілізацыі сродкаў. Ніводнага рубля запазычанасьці па паявых узносах, сельгаспадатку, страхоўцы і самаабкладаньні. Ніводнага рабочага, служачага, калгасьніка і аднаасобніка без ашчаднай кніжкі і не падпісаўшагася або не купіўшага аблігацыі пазыкі 3-га рашаючага году 5-ці годкі.

д) На стварэньне „Чырвонай кнігі"

аднажам арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньнем саўгасаў і калгасаў. Замацуем зьдзельшчыну, ліквідуем кулацкую ўраўнілаўку, абязьлічку і спажывецкія настроі. Выканаем пляны загатовак і ўкамплектаваньне малочна-таварных і сьвінагадоўчых фэрм.

е) Займем месца ў „Чырвонай кнізе"

пасьпяховым ажыцьцяўленьнем задач культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых. Выканаем пастанову партыі і ўраду па камунальнай гаспадарцы, жыльлёвым будаўніцтве. Рашуча палепшым работу фажывецкай кааперацыі, дзяржгандлю і грамадзкага харчаваньня.

ж) Займем месца ў „Чырвонай кнізе"

поўным і пасьпяховым ажыцьцяўленьнем пастановы ЦК аб пачатковай і серадняй школе. Больш увагі настаўніку, політэхнізацыі школы і школьнаму будаўніцтву.

Аб дасягнутых посьпехах на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, аб выкананьні ўзятых на сябе абавязкаў на працягу лістапада і сьнежня месяца дамо партыі і ўраду рапарты сельсаветаў, дэпутацкіх груп і сэкцый.

Сакратар Менгаркому КП(б)Б — КАВАЛЬЧУК.
Старшыня Менгарсавету — ВАЛОДЗЬКА.
Старшыня Гарпрафсавету — ШУЛЬКІН.
Сакратар Гаркому ЛКСМБ — ЯНКОВІЧ.

Прыкладнай работай дабіваецца Селецкі сельсавет месца у „Чырвонай кнізе"

Селецкі сельсавет, Магілеўскага раёну па ўдарнаму змагаецца за месца ў „Чырвонай кнізе". За апошні час прэзыдыум сельсавету разгарнуў вялікую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасу. Па ўсіх калгасах сельсавету ўсе работы пераведзены на зьдзельшчыну. Наладжаны вучот працы. Ёсьць значныя дасягненьні у галіне правільнай расстаноўкі рабочай сілы. У сучасны момант сельсавет калектывізаваны на 83 проц.

Плян загатовак па ўсім сельсавеце поўнасьцю выкананы як па збожжы, так і па бульбе. Для лепшага правядзеньня загатовак былі складзены ўдарныя брыгады, якія працавалі па асобных калгасах. Такія брыгады складаліся па галіне ільнапрацоўкі, малацьбы, камплектаваньня стада, загатоўкі мяса і г. д.

Брыгады ўступілі паміж сабой у сацспаборніцтва. Селецкі сельсавет разгарнуў шырокую працу па перабудове работы саветаў. Створаны сэкцыі, брыгады, у якія ўцягнуты актыў з калгасаў і аднаасобнікаў.

Асноўная ўвага зьвернута на далейшае арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Селецкі сельсавет, бязумоўна, кандыдат у „Чырвоную кнігу саветаў".

Цімох Лявіцкі.

Ключ да перамогі

(Да пытаньня аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў)

П*)

Ліквідацыя абязьлічкі ў працы, уладкаваньне ў сыстэме разьмеркаваньня калгасных даходаў і ўраджаю і ў выдачы натуральных авансаў, правільная расстаноўка калгасных сіл па вучастках, брыгадах і г. д., разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, сустрэчных плянаў, сустрэчных норм выпрацоўкі — усё гэта мае гігантскае значэньне для арганізацыі адыходніцтва, для новых форм снабжэньня сацыялістычнай прамысловасьці рабочай сілай. Іменна на аснове максымальнага ўшчыльненьня рабочага дня ў калгасах і разгортваньня рацыяналізатарскай работы можна дамагчыся вызваленьня калгасамі лішняй у колгасах рабочай сілы для сацыялістычнай прамысловасьці і саўгасаў.

Бягучы год паклаў пачатак арганізаванаму набору рабочай сілы для прамысловасьці і саўгасаў у калгасах. Улічыць вурокі гэтага году — жыцьцёвейшая неабходнасьць.

Перш за ўсё прыходзіцца сказаць аб спробах паасобных калгасаў затрымаць арганізацыю адыходніцтва, ня пусьціць у адыход колгасьнікаў, ня гледзячы на дэкрэты ўраду і пастановы НКЗ і калгасцэнтраў СССР і БССР. Былі спробы ў паасобных калгасах пазбавіць сем'і адыходнікаў, добрасумленна выконваючых вытворчыя заданьні праўленьня калгасаў, права на атрыманьне натуральнай часткі ўраджаю і даходаў, зноў такі паперакор зусім чоткім дырэктывам партыі і ўраду. Мы ведаем аб выпадках, калі адыходніка адкідвалі назад з будоўлі ці заводу, пагражаючы выключэньнем з калгасу.

Усе гэтыя факты можна тлумачыць так: тут выразна сказалася падрыўная работа кулацтва, накіраваная на зрыў новых форм вытворчай сувязі паміж пралетарскім горадам і калгаснай вёскай; тут таксама выразна сказалася права-апартуністычная стаўка паасобных кіраўнікоў калгасу, іх спроба самавыпрахавацца «на ўсялякі выпадак» лішняй рабочай сілай, іх стаўка на самацёк у барацьбе за калгасны ўраджай, іх няўменьне (ці нежаданьне) шляхам правільнай расстаноўкі сіл калгасьнікаў, ушчыльненьня рабочага дня, падвышэньня прадукцыйнасьці працы выканаць плян і пры меншай, але зусім дастатковай, колькасьці рабочых рук.

Вурокі бягучага году неабходна ўлічыць тым больш, што калгасы прыступаюць ужо да складаньня вытворчых плянаў на 1932 г. Трэба ў рашучай і бязьлітаснай барацьбе з кулаком і яго агентурай ў радах партыі—правымі і «левымі» апартуністамі забяспечыць самім плянам і ў самім пляне справу арганізацыі кожным калгасам адыходніцтва. Трэба цьвёрдай разгарнуць папулярызацыю адпаведных дырэктыў партыі і ўраду сярод калгасьнікаў.

З другога боку, павінны больш шпарка пазарочавацца і арганізацыі фабрык і заводаў. Іменна зараз павінна быць асабліва шырока разгорнута шэфская работа. Трэба гаспадарча-палітычных дагаворамі паміж прамысловымі прадпрыемствамі і калгасамі па пытаньні аб адыходніцтве ахапіць усе калгасы, з тым, каб гэтыя дагаворы ўвайшлі арганічнай часткай у вытворчы калгасны плян 1932 г.—апошняя га году нашай пяцігодкі.

Рабочыя павінны панесьці ў калгасы вопыт арганізацыі ўдарніцтва і сацспаборніцтва, практыку ўдарных тэмпаў у рабоце, сустрэчных плянаў і сустрэчных норм. Узброенае гэтым вопытам, калгаснае сялянства абвергне апартуністычныя разважаньні накшталт таго, што «у нас саміх нехапае рабочых рук», высуне баявыя нормы выпрацоўкі, пакажа бальшавіцкія тэмпы работы і вылучыць лепшых сваіх прадстаўнікоў для работы ў сацыялістычнай прамысловасьці і ў саўгасах.

Заключэньне двухбаковых гаспадарча-палітычных дагаворамі—зялікая палітычная справа. Яна і павінна быць адпаведна праведзена—не па дзялянку, а па—бальшавіцку. Кожны калгасьнік—удзельнік заключэньня такога дагавору. Падпісаньне дагавору павінна праводзіцца не пры закрытых дзьвярох калгасных праўленьняў а на шырокіх сходах калгасьнікаў. Толькі ў гэтым выпадку будзе забясьпечана перамога новых форм снабжэньня сацыялістычнай прамысловасьці арганізаваным прытокам рабочай сілы, а гэта будзе азначаць далейшае ўмацаваньне вытворчай сувязі паміж пралетарыятам і яго саюзьнікам і апорай.

*) Канец. Початак гл. у № 265.

Мы гаварылі вышэй аб тым, што барацьба кулацтва супроць калгасаў ідзе на даным этапе ў асноўным зводзіцца да шматлікіх манэўраў узрываць калгасы з сярэдзіны, падарваць працэс арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, падарваць калгасную вытворчасьць, распаліць спажывецкія настроі, дробна-буржуазную стыхію, процідаставіць інтарэсы калгаса і калгасьніка інтарэсам пралетарскай дзяржавы.

Кулацтва з усіх сіл змагаецца супроць ліквідацыі ўраўнілаўкі і абязьлічкі ў калгасах, супроць арганізацыі адыходніцтва, супроць пераразьмеркаваньня галіне справа не абыходзіцца без паасобных посьпехаў кулацтва на паасобных вучастках.

Мы сустракаемся з праяўленьнямі дробна-буржуазнай стыхіі, з кулацкімі спажывецкімі настроямі ў пад'ёмных калгасах, з буржуазнымі тэндэнцыямі паасобных кіраўнікоў калгасаў. Мы ведаем аб выпадках устаўленьня надморна павялічаных норм пры разьмеркаваньні натуральнай часткі ўраджаю і даходаў, што па сутнасьці прыводзіла да расьцягваньня збожжа і іншага на едаках. Мы ведаем аб выпадках браніраваньня ўсялякіх фондаў —карнавых, спрахавых і інш. — за кошт хлебазагатовак, за кошт закантрактаванага збожжа. Мы ведаем так сама аб выпадках кулацкіх прыёмаў утойваньня хлеба.

Зразумела, такія факты не прадстаўляюць з сябе масавага зьявішча. Мы побач з гэтымі фактамі магілі-б падаць назвы сотняў і сотняў калгасаў, якія датэрмінова ня толькі выканалі, але і перавыканалі загатоўчыя пляны. Аднак, ня прыслухацца да паданых сьцягалаў было-б па меншай меры палітычнай наўнасьцю ці глупстваю. Гэтыя сігналы лішні раз гавораць аб тым, што трэба змагацца з правааапартуністычнай ідэалізацыяй калгасу, што нельга забывацца, што «у арцелі не заваршаецца, а толькі пачынаецца справа стварэньня новай грамадзкай дысцыпліны, спраза навучаньня ня сялян сацыялістычнаму будаўніцтву». Іменна такая права-апартуністычная ідэалізацыя калгасаў у радзе месц прывяла да права-апартуністычнай стаўкі на самацёк, да забясьпечаньня таго, што клясавая барацьба працягваецца ў нашай краіне, што элементы клясавай барацьбы ёсьць і ўнутры калгасаў. У радзе месц забыліся аб тым, што загатоўчую кампанію трэба праводзіць і ў калгасах, праўда, іншымі формамі і іншымі мэтадамі, чымся ў аднаасобным сэктары. У радзе месц забыліся аб тым, што арганізацыя загатовак у калгасах зьвязана самым шчыльным чынам з барацьбой, з дапамогай калгасам ў іх арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні з дапамогай ім у лепшай арганізацыі працы правільным разьмеркаваньні ўраджаю і даходаў, якое (правільнае разьмеркаваньне) не дае магчымасьці распяваць хлеб па сьвірнах і пуніях, ня выканаўшы перш за ўсё і раней за ўсё сваёго абавязку перад пралетарскай дзяржавай.

Гэты вурок павінен быць улічаны ўсімі намі і перш за ўсё партыйнымі і савецкімі органамі, калгаснымі загатоўчымі арганізацыямі лёнаводных раёнаў, дзе зараз разгортваецца масавая загатоўчая кампанія. Арганізаваць сапраўды бальшавіцкімі тэмпамі загатоўкі лёну і канапель, выканаць заданьне ЦК КП(б)Б—загатовіць да 10 сьнежня 70 проц. усяго лёнавалакна немагчыма без ажыцьцяўленьня двух умоў: 1) барацьбы са спажывецкімі кулацкімі настроямі ў паасобных калгасах і 2) дапамогі калгасам у лепшай арганізацыі працы на мяцьці і трапаньні лёну, у арганізацыі ільнянага канвэеру: з лёнавых палёў—на лёназаводы, з мяльна-трапальных пунктаў—у дзяржаўныя склады.

У найкарацейшы тэрмін трэба ліквідаваць адставаньне калгаснага сэктару ў загатоўках, забясьпечыць выкананьне і перавыкананьне загатоўчых плянаў, арганізуючы масы калгасьнікаў на высоўваньне сустрэчных плянаў, на стварэньне чырвоных абозаў і г. д. Поўная перамога калгасаў на загатоўках, поўнае выкананьне калгасамі загатоўчых плянаў будзе найлепшым ударам па спробах кулацтва супроць паставіць інтарэсы калгасу і калгасьніка інтарэсам пралетарскай дзяржавы, будзе буйнейшым крокам наперад па шляху арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Буйнейшае значэньне ў барацьбе за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў набывае пытаньне аб калгасных кадрах. «Адзін з самых выдатнейшых заваёў калгаснага руху ў тым, што ён пасьпеў ужо высунуць тысячы арганізатараў і дзесяткі тысяч агітатараў калгаснай сялны з сваіх сялян,» — гаварыў тав. Сталін на XVI зьезьдзе УсеКП(б). За час з XVI партзьезду рады арганізатараў калгаснага руху, высунутых асяродзьдзем саміх калгасьнікаў, значна ўзрасьлі і ўмацаваліся. З другога боку, нельга недаацэньваць найважнейшай ролі і значэньня тых 25 тысяч лепшых рабочых, якія былі пасланы пралетарыятам на вёску, каб стаяць на чале масавага пагароту сялянства да сацыялізму і наладзіць калгасную вытворчасьць. Аднак, перад тварам новых задач, за ўмовах новых абставін, стварыўшыхся на вёсцы, на новым этапе калгаснага руху пытаньне аб калгасных кадрах—і з боку якасьнай і з боку колькаснай—набывае асаблівую вострасьць. У гэтым артыкуле мы маем на ўвазе гаварыць аб масавых калгасных кадрах.

Нам патрэбны калгасныя кадры, якія-б прайшлі школу марксыцка-ленінскага выхаваньня ў шчыльнай ўвязцы з задачамі аўладаньня аграэтэхнікай і тэхнікай арганізацыі калгаснай вытворчасьці.

Мы, БССР—краіна лёну і канапель, мясной і малочнай жывёлагадоўлі, гародніны і бульбы. Нам і патрэбны тысячы людзей, якія-б добра ведалі як трэба змагацца за большыя ўраджаі нашых палёў, за лепшую якасьць прадукцыі, нам патрэбны тысячы пісьменных даярак, сьвінароў і конюхаў, нам патрэбны тысячы знатакоў сіласа і г. д. і г. д.

Мы, БССР—краіна, мэліярацыя ў якой можа «варыць—і творыць—цуды ператварэньні вялізарныя балотныя масывы ў квітнеючыя палі і лугі». Нам патрэбны майстры гэтых цудаў».

Нам патрэбны людзі, якія-б добра ведалі законы сеязвароту ў данным канкрэтным арэсцовасьці, у канкрэтных умовах гэткай-та структуры глебы і пэўнай накіраванасьці, пэўнай спэцыялізацыі гаспадаркі.

Але нам трэба, каб гэтыя людзі масавых прафэсій на «адноўленай зямлі» добра ведалі задачы партыі, былі-б адданымі партыі, умелі мужна і самаахвярна змагацца з кулаком. Гэта—складнейшая задача. Яе ня вырашыць адным махам, але да рашэньня яе неабходна прыступіць сур'ёзна, з неабходным размахам. Сетчай курсаў, школ, калгасных школ—пэрсонах, інстытутам разьнастайных лектароў. сетчай заочнага навучаньня трэба пакрыць усю калгасную Савецкую Беларусь. Над рашэньнем гэтай задачы трэба работаць упарта, настойліва, сыстэматычна, пры чым у першую чаргу, трэба прыцягнуць да вучобы кадраў актыў, перадавых калгасьнікаў, калгасьнікаў—ударнікаў.

Трэба самім зразумець і змагчы шырока папулярызаваць думку, што немагчыма арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў без бальшавіцкага выхаваньня калгасьнікаў, без аўладаньня аграэтэхнікай і тэхнікай арганізацыі калгаснай вытворчасьці.

У гэтай сувязі нам хацелася-б хоць у некалькіх словах спыніцца на адным з пытаньняў кіраўніцтва калгасамі.

Мэтады камандаваньня і адміністраваньня, якія вядуць фактычна да адхіленьня мас калгасьнікаў ад непасрэднага кіраўніцтва ў калгасе, скары стоўзаюцца кулацтвам для супроць-пастаўленьня інтарэсаў калгасьніка інтарэсам пралетарскай дзяржаве. Гэткія «лявацкія» скажэньні сурова асуджаны партыяй. З другога боку, правым апартуністам было-б цяпершча ў квасьце падчас дробна-буржуазных настроеў адсталых мас калгасьнікаў.

Задача бальшавіцкага кіраўніцтва калгасамі зводзіцца да таго, каб разгортваючы ўнутрыкалгаснага дэмакратыю, унутры-калгасную грамадзкасьць, змагаючыся з права-апартуністычнай хвасьцізкай практыкай і «левымі» перагібамі, абапірацца на перадавых калгасьнікаў, на калгасны актыў і паляміць масы калгасьнікаў да разуменьня агульна-дзяржаўных задач, да разуменьня іх свайго месца і сваіх задач у сацыялістычным будаўніцтве.

***

Трэба зразумець, што асноўнай і рашаючай задачай, цэнтральнай задачай бягучага перыяду калектывізацыі зьяўляецца арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў».

«Хто гэта зразумее, той адразу пойдзе ў нагу з партыяй. Хто адразу не зразумее, што галоўнай задачай цяпер становіцца барацьба за ўмацаваньне гаспадаркі ў калгасе і барацьба за палепшэньне ўраджаю, той не зразумее задач партыі, той пойдзе супроць лініі партыі ў сучасны момант». (Якаўлеў).

А ў барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў 6 стаўлікіх умоў—ключ да перамогі.

С. Праўда.

Да ведама ўсіх чытачоў газ. „Савецкая Беларусь"

З прычыны тэхнічнай няспраўнасьці газэта вышла на дзьвюх старонках

Іграшацкі сельсавет—у глыбокім тылу

Іграшацкі сельсавет не пачаў яшчэ масавага агляду работы і назат ня рыхтуецца да справаздачнай кампаніі саветаў. Сельсавет працуе па старому. У выніку адсутнасьці належнага кіраўніцтва з боку сельсавету работа па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў не праводзіцца.

У калгасах ня ўведзена зьдзельшчына, ня зьяўлічана абязьлічка. Калгасы Іграшацкага сельсавету ня ўзялі яшчэ палову зябу. Арганізаваныя 2 калгасы ў час асеньня-пасеўнай яшчэ добра не ўмацаваны. Працуюць без зьдзельшчыны, без працоўных кніжак і засьмечаны кулацкімі элементамі. Гэта калгас «Знамя працы». Іграшацкі сельсавет добра ад гэтым ведае, але захадаў ніякіх ня прымае.

Наогул усе калгасы Іграшацкага сельсавету засьмечаны кулацка-варожымі элементамі, якія шкодзяць усёй працы калгасаў.

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб сацыялістычнай жыцьцёлагадоўлі не прапрацавана і не ажыцьцяўляецца на справе. Пастановы НКЗему і Калгасцэнтру аб разьмеркаваньні ўраджаю ў калгасах не прапрацаваны і разьмеркаваньне ўраджаю па калгасах не пачата.

Іграшацкі сельсавет адстае і ў галіне культурнага будаўніцтва. Хаты чытальні не працуюць. Так, Іграшацкая хата чытальня не працуе. Ужо змалку кажуць 2 год тут ня было ў ёй ніводнага чалавека. Газэты і часопісы, якія выпісваецца вельмі шмат, недзе губляюцца, ніхто іх ня чытае. Ліквідацыя непісьменнасьці па сельсавету не праводзіцца, між тым па сельсавету вельмі высокі процант непісьменных. Насьценгазэты па калгасах і сельсаветах ня выпускаюцца, хоць актыў калгасьнікаў і актыўістых ёсьць.

Выкананьне розных відаў заказтовак па сельсавеце ідзе дрэнна. Старшыня Іграшацкага сельсавету т. Дзеніна бязьдзейнічае і ніякіх захадаў ня прымае для перабудовы саветаў.

Такое-ж становішча ў Іграшацкім сельсавеце ідзе далей недапушчальна. Зараз-жа неабходна ажыцьцявіць усю работу і перажлючыцца на баявыя тэмпы работы. У часе правядзеньня спаборніцтва саветаў за стварэньне «Чырвонай кнігі» трэба ўзяць работу сельсавету Крушчыны.

А. Вясковы.

Асьветнікі Случчыны ўключаюцца ў сацыялістычнае спаборніцтва саветаў.

Случак. (Наш. кар.). З 13 па 15 лістапада адбывалася раённая канфэрэнцыя асьветнікаў Случчыны. На гэтай канфэрэнцыі асьветнікі вынесьлі пастанову аб актыўнай дапамозе сельсаветам, якія ўключыліся ў сацспаборніцтва за месца ў „Чырвонай кнізе сацыялістычных рапартоў саветаў". У прынятай пастанове галоўная ўвага зьвернута на працу культмасавых сэкцый сельсавету і практычнае ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і серадняй школе.

А Курдо.

ВУЧЭНЬКЕ па сьветам скіроўцы

22 лістапада а 23 гадзіне па гор. Менску будзе праводзіцца вучэньне па сьветамаскіроўцы.

Спачатку вучэньня, будзе даны сігнал «паветранай трывогі». Вучэньне будзе працягвацца да сігналу «адбой».

Па сігналу «паветранай трывогі» неабходна прыняць усе меры забясьпечваючыя зацямненьне гораду:

1) Вулічныя ліхтары выключаюцца Эльводам.

2) Знадворныя лямпкі ля дамоў выключаюцца па загаду старшынь Жактаў.

3) На прадпрыемствах і ў установах выключэньне сьвятла праводзіцца па загаду дырэктароў прадпрыемстваў (бяз страты для вытворчасьці).

Усяму насельніцтву забараняецца запальваць сьвятло, калі вокны ня будуць завешаны сьветанепраходзячымі шторамі.

Асобы вінаватыя за выкананьне гэтых указаньняў будуць прыцягвацца да адказнасьці згодна абавязковай пастановы Менгарсавету ад 12 верасьня, надрукаванай ў газэтах ад 14 верасьня.

Збор рабочых і служачых у час вучэньня па сьветамаскіроўцы не праводзіцца.

Рух па горадзе ня прыпыняецца.

Начальнік пункту СПА г. Менску ПЭХОЎСКІ.
Начальнік штабу КАПІЦІН.

Палітыка СССР--пасьлядоўная палітыка міру

Ад Народнага Камісарыяту па Замежных Справах

Заява японскага пасла Хірота

Пры наведаньні Народнага камісарыяту замежных спраў 19 лістапада японскі пасол Хірота зрабіў тав. Літвінаву наступную заяву:—

У часе савецка-кітайскага канфлікту ў 1929 г. імпэратарскі ўрад прытрымліваўся палітыкі строгага няўмяшаньня. Ён адмаўляўся перавозіць кітайскае войска, якое накіроўвалася ў раён станцыі Манчжурыі, што мабыць яшчэ засталося ў намяці Саюзнага ўраду. Пагэтаму імпэратарскі ўрад з кітайскага канфлікту чакаў з боку Саюзнага ўраду палітыкі строгага ня ўмяшаньня і не аказаньня дапамогі якім-бы та ні было кітайскім войскам.

Імпэратарскі ўрад выказаў сваё здавальненьне адносна заявы саюзнага ўраду ад 29 кастрычніка, якая пацьвердзіла тэта спадзяваньне імпэратарскага ўраду. Імпэратарскі ўрад ня верыць розным чуткам, якія ідуць пасьля азначанай заявы. Ён катэгарычна заяўляе, што ня можа быць і гутаркі аб тым, што японскае консульства і вайсковая ўлада выдумваюць чуткі і распаўсюджваюць іх праз друк і тэлеграфныя агенцтвы.

Што датычыцца заяў японскай вайсковай улады ў Мукдэне з гутаркі японскага віцэ - консула ў Харбіне, памянёных у заяве саюзнага ўраду ад 14 лістапада, што хоць японскаму ўраду не вядома ў якой форме яны былі перададзены, ён думае, што першыя проста тарарылі супрацоўнікам газэт, што ідуць пабочныя чуткі, (яны распаўсюджваюцца ў Харбіне), а другі адкрыта падзяляўся той інфармацыяй, якая мелася, гэта зьяўляецца недапушчальным непаразуменьнем думаць, што японская ўлада выдумвае ня маючыя ніякай падставы чуткі. Па водле маючыхся вестак, кітайскі бок распаўсюджвае чуткі аб атрыманьні кітайскім войскам розгана роду дапамогі ад СССР з мэтаю ўзьняцьця духу хейлунцзянскага войска. Пагэтаму Саюзнаму ўраду, заявіўшаму аб сваёй палітыцы неўмяшаньня належала-б накіраваць сваю скаргу хутчэй кітайскаму боку. З прычыны абвостранага становішча паміж японскім і кітайскім войскам, японскі ўрад чакае выразнай заявы аб тым, што Саюзны ўрад ня будзе дапамагаць войску генэрала Ма, дастаўляючы ім зброю і іншыя матар'ялы.

Імпэратарскі ўрад, вымушаны выступіць на самаабарону сваіх правоў і інтарэсаў у Манчжурыі і Манголіі, зразумела пастараўся, каб інтарэсам СССР ня была нанесена шкода. Хейлунцзянскае войска ў парушэньне пры нятай згоды, ня толькі напала на малакольканасныя японскія часьці, пасланыя для абароны рамонтнай брыгады чыгуначных мастоў і Таованьо-Цыцыкарскай чыгункі, але і сьцягнуліся ў раён Цыцыкара шмат падчаванняў з захаду і ўсходу, і там пагражаюць нашаму малакольканаму войску.

Японскае войска ня мае ні малейшага намеру паралізаваць дзейнасьць Усходняй - Кітайскай чыгункі, але калі хейлунцзянскае войска ня спыніце прытрымліваўца правакацыйна - гарыстых адносін да японскага войска, дык становішча нямінучым сутычка паміж супроцьстаячымі адзін да аднаго войскам, з прычыны чаго раён Ананьцзы можа часова аказацца ў замяшаньні. Імпэратарскі ўрад прымае меры да таго, каб ухіліцца такой сутычкі і не нанесці шкоду Усходняй-Кітайскай чыгунцы, паколькі войска генэрала Ма не скарыстае ў сваёй мэце гэтай чыгункі. Аднак калі ня гледзячы на нашы стараньні адбудзецца нашчасная падзея, дык адказнасьць за гэта падае бясспрэчна на кітайскі бок. Адказнасьць за гэта павінна несьці таксама Усходняя - Кітайская чыгунка, якая дапусчала на ёй сьцягваньне і перавозку кітайскага войска».

Захоп японскім войскам Цыцыкара

ТОКІО. 19-XI. 18 лістапада ўвечары японскае войска заняла Цыцыкар, перайшоўшы лінію У.-К. чыгункі на адлегласьці 4 лі (лі — 0,6 кілём.) ад станцыі Ананьцзы. Цыцыкарская паліцыя разброена. Ма знаходзіцца ў Коўшанчане.

Паводле паведамленьня Сімбун Рэнпа з Харбіну, Чжан Цзін-гуй (галоўна камандуючы асобага раёну, узначальвае «камітэт безапаснасьці» ў Харбіне), атрымаўшы весткі аб узяцьці Цыцыкара, паращыў узяць на сябе кіраўніцтва Хэйлунцзянскай правінцыяй і са згоды японскай улады выехаў у Цыцыкар.

Паводле тых-жа вестак, пераход праз лінію У.-К. чыгункі не зрабіў ніякай шкоды У.-К. чыгунцы: рух адбываецца нармальна. У баёх не пацярпела нават Таованьо-Ананьцзыйская чыгунка

Штаб-кватэра 2-й дывізіі японскіх войск 18 лістапада пераведзена ў Ананьцзі.

Заява японскага ўраду

МАСКВА. 20-XI. У Токіе 19 лістапада таварыш міністра замежных спраў Японіі пан Нагаі запрасіў паверанага ў справах СССР і па даручэньні японскага ўраду зрабіў яму для перадачы савецкаму ўраду заяву аб прычынах, якія пабудзілі японскую армію перайсьці У—К. чыгунку. Пан Нагаі заявіў таксама, што салдатам і афіцэрам японскай арміі даны спэцыяльны загад ні ў якім выпадку не рабіць ніякай шкоды У—К чыгунцы пры пераходзе праз яе. Апрача таго, таварыш міністра замежных спраў заявіў, што як толькі нагова назначаны начальнік аховы прыбудзе ў Цыцыкар і аднаўць парадак, японскае войска неадкладна выйдзе з Цыцыкару на поўдзень. Нагаі сказаў, што дакладнага тэрміну ён указаць ня можа, але што па яго асабістай думцы гэта зойме 4-5 дзён.

Нагаі прасіў перадаць савецкаму ўраду аб незьмінна прыяцельскіх адносінах японскага ўраду да СССР і асобна падкрэсьліў, што прыняты ўсе захады для таго, каб ня было ўчынена ніякай шкоды У.-К. чыгунцы.

Дадатковая заява ў тым-жа сэнсе была зроблена японскім паслом п. Хірота ў часе ўчарайшага прыёму яго Літвінавым.

К. І.

Адказ тав. Літвінава

Тав. Літвінаў прыняў учора, 20-га лістапада японскага пасла пана Хірота і ў адказ зрабіў яму наступную заяву: «Савецкі ўрад са здаволеньнем прымае да ведама Вашу, пан пасол, заяву аб тым, што японскі ўрад ня верыць чуткам аб парушэньні прынцыпу няўмяшаньня і аб аказаньні савецкай дапамогі кітайскім генэралам і што ён, такім чынам, адмяжоўваецца ад безадказных заяў, зробленых японскімі афіцыяльнымі асобамі, відавочна бяз санкцыі свайго ўраду. Савецкі ўрад ня мог чакаць другіх адносін з боку японскага ўраду да азначаных чутак пасьля вядомай заявы пана Карахана, зробленай ім па даручэньні ўраду аб суровым неўмяшаньні ў японска-кітайскі канфлікт і неаказваньні ні аднаму, ні другому боку якой-бы то ні было дапамогі.

Паколькі ў Вашай заяве, пане пасол дрыводзіцца некаторая аналёгія паміж сёньняшнімі падзеямі ў Кітаі і савецкім канфліктам у 1929 годзе, я змушаны адзначыць няправільнасьць аналёгіі. Ня гледзячы на відавочнае для ўсіх і грубае парушэньне кітайскай уладай дагаворных правоў, савецкі ўрад не нападаў і ня думаў нападаць на Манчжурыю. Толькі пасьля паўторных нападаў кітайскіх і расійскіх белагвардзейскіх атрадаў на савецкую тэрыторыю, савецкае войска перайшло Манчжурскую межу для ад'біцьця нападу, разбраеньня нападаўшых і спыненьня далейшых нападаў. Пры гэтым ніякага пытаньня аб магчымасьці акупацыі хоць-бы і часовай савецкім войскам кітайскай тэрыторыі, адпісьненьняў існуючай улады і стварэньня новай ня ўзьнікала.

Ня было тады і самай далёкай магчымасьці парушэньня законных правоў і інтарэсаў Японіі. Як толькі савецкае войска выканала свае абмежаванае заданьне,—яно было адкінута назад на савецкую тэрыторыю. Савецкі ўрад не скарыстаў пры гэтым сваёй ваеннай перавагі і слабасьці Кітаю для навязваньня апошняму якіхбы то ні было новых умоў для вырашэньня праблем, зьвязаных непасрэдна з узьніклым канфліктам.

Калі Вы, пане пасол, паведамляючы аб адмаўленьні японскага ўраду ў перавозцы кітайскага войска ў 1929 годзе маеце на ўвазе Паўднёва-Манчжурскую чыгунку і гэтаму проціставіце меўшыя нібыта месца перавозкі кітайскага войска па У.-К. чыгунцы пры сучасным японска - кітайскім канфлікце, — дык павінен даць Вам наступнае тлумачэньне. Паўднёва - Манчжурская чыгунка знаходзіцца пад поўным кіраўніцтвам і кантролем Японіі і ахоўваецца японскім войскам, між тым, як У.-К. чыгунка знаходзіцца пад мяшаным савецка - кітайскім кіраўніцтвам і ахоўваецца кітайскім войскам, падпарадкаваным выключна кітайскай уладзе.

Вам павінна быць вядома, што савецкі ўрад добраахвотна адмовіўся ад прывілею царскага ўраду трымаць свае войска ў Кітаі, і ў прыватнасьці на У.-К. чыгунцы. І ён ня каецца ў гэтым, бо перакананы, што зрабіў зусім правільна адмовіўшыся ад прывілею царскага ўраду. Але з гэтага ня вынікае, што нельга ўтоесамляць умовы на Паўднёва - Манчжурскай чыгунцы з умовамі на У.-К. чыгунцы.

Савецкаму ўраду невядома, каб кітайскае войска варты У.-Ж. чыгункі перавозіла па У.-К. чыгунцы для ваенных мэтаў. У гэтым і ня было неабходнасьці пакуль зона японска-кітайскага канфлікту абмяжоўвалася раёнам Паўднёвай Манчжурыі. Гэткая небясьпека магла ўзьнікнуць толькі з моманту прасоўваньня японскага войска да лініі У.-К. чыгункі. І калі гэткая небясьпека зрабілася рэальнай, савецкі ўрад улічыў гэтыя абставіны і 12 лістапада даў савецкай часткі праўленьня У.-К. чыгункі дырэктыву аб тым, каб працягваць прынцып нейтралітэту і ні ў якім разе не згаджацца на перавозку на фронт войска таго ці іншага ваюючага боку па У.-К. чыгунцы. І сапраўды, ня гледзячы на ўсе выпадкі створаныя блізкасьцю фронту, У.-К. чыгунка здолела захаваць рэжым нейтралітэту.

Я лічу патрэбным, пане пасол, зрабіць гэтае тлумачэньне, каб падкрэсьліць, што я не магу згадзіцца з Вамі наконт адказнасьці У.-К. чыгункі.

Савецкі ўрад са здаволеньнем прымае да ведама пауторныя заверэньні японскага ўраду ў яго стараньнях аб недапушчэньні шкоды інтарэсам У.-К. чыгункі і СССР і ў адсутнасьці ў японскага войска намеру паралізаваць дзейнасьць У.-К. чыгункі.

Аднак, прыходзіцца канстатаваць, што ня гледзячы на першапачатковае паведамленьне, зробленае мне Вамі, пане пасол, па даручэньні Вашага ўраду аб адданым ім распараджэньні і максымальным звужэньні ваенных апэрацый у Манчжурыі, — гэтыя апэрацыі з таго часу значна пашырыліся і выйшлі далёка за межы першапачатковай іх зоны. Гэтая акалічнасьць, якая пашырае магчымасьць закранань ня інтарэсаў СССР, ня можа ня выклікаць у савецкага ўраду сур'ёзнага непакою.

Савецкі ўрад пасьлядоўна ва ўсіх сваіх адносінах з іншымі дзяржавамі праводзіць суровую палітыку міру і мірных адносін, ён надае вялікае значэньне да захаваньня і ўмацаваньня існуючых адносін з Японіяй. Савецкі ўрад прытрымліваецца палітыкі суровага неўмяшаньня ў канфлікты паміж рознымі краінамі. Ён разьлічвае, што і японскі ўрад імкнецца да захаваньня існуючых адносін паміж паасобнымі краінамі і што ён ва ўсіх сваіх дзеяньнях і распараджэньнях будзе ўлічваць непарушальнасьць інтарэсаў СССР».

Для чаго патрэбна хлусьня аб дапамозе СССР генэралу Ма

БЭЙПІН. 18-XI. З Харбіну паведамляюць: «Супрацоўнік лёндаінскай газэты «Дэйлі мэйл», які знаходзіцца тут, паведаў японскага консула ў Харбіне, якога прасіў даць абвяржэньне праз японскія тэлеграфныя агенцтвы наконт прыпісаньня яму газэтай «Харбинское время» інтэрв'ю, у якім нібыта заявіў, што сам ён бачыў, як савецкая вайсковая улада наглядала за адпраўкай цягніка з знарадамі для генэрала Ма.

Карэспандэнт заявіў, што падобнага інтэрв'ю ён ніколі не даваў і ніколі ня бачыў ніводнага савецкага салдата ў войску Ма. «Я,—заявіў карэспандэнт газэты,—надзвычайна зьдзіўлены, што японцы зьвяртаюцца да мэтадаў хлусьлівай інфармацыі.»

Японія і ня думае эвакуявацца з Манчжурыі

НЬЮ-ЁРК. 19-XI. Член японскага парляманту Асакі наведаў сакратара Бора. Пасьля наведваньня Бора, заявіў прадстаўніку друку: «Не падлягае сумненьню, што Японія мае намер устаўавіць свае панаваньне ў Манчжурыі».

Мяльна-трапальным пунктам-поўную нагрузку

Укараняючы зьдзельна-прэміяльную сыстэму — арганізаваць двухзьменную апрацоўку лёну і канапель. Прымусіць кулака выканаць цьвёрдыя заданьні па лёнавалакну

Ліквідаваць разрыў паміж апрацоўкай і загатоўкай тэхнічных культур

Апрацоўка і загатоўка тэхнічных культур—лёну і канапель—зьяўляецца адным з важнейшых палітычна-гаспадарчых кампаній, праводзімых зараз партыяй і ўрадам на вёсцы. Месячнік апрацоўкі і загатоўкі (продаж дзяржаве) тэхкультур, абвешчаны ЦК КП(б)Б, павінен даць рашучы пералом у галіне лёназагатовак.

Ня гледзячы на тое, што прайшла ўжо цэлая дэкада спачатку абвешчэньня месячніка, а ў справе лёназагатовак не намеціўся яшчэ пэўны пералом. Па 15 лістапада сьцёрта лёну 14,9 проц. пляну, а загатоўлена лёнавалакна на гэты тэрмін толькі 6,3 проц. Плян абмалоту лёну выкананы на 97,4 проц., загатоўкі-ж семя праведзены толькі на 43,2 проц.

Такое-ж самае становішча наглядаецца і ў справе апрацоўкі і загатоўкі канапель і пянькі. Канапель сьцёрта 4,5 проц. пляну, загатоўлена пянькі толькі 0,5 проц.

Прыведзеныя лічбы сыгналізуюць аб стварэньні разрыву паміж апрацоўкай і загатоўкай тэхнічных культур. Гэты разрыў неабходна зараз-жа ліквідаваць шляхам увядзеньня зьдзельна-прэм'яльнай аплаты пры апрацоўцы тэхкультур, шляхам арганізацыі непарыўнага казвэеру паміж апрацоўкай і продажаю валакна, пянькі, семя і канапель загатоўчым пунктам.

Недапушчальным зьяўляецца такое становішча, калі асноўныя лёнаводныя раёны не пераключыліся на масавае цярпё лёну. Напрыклад, Чашніцкі раён выканаў плян цярпя лёну на 0,8 проц., Гарадоцкі—3,1 проц., Віцебскі —3,2 проц. і г. д.

Трэба рашуча пакончыць з усякай недаацэнкай апрацоўкі і загатоўкі тэхнічных культур. Апрацоўку лёну і канапель трэба зараз паставіць у цэнтр увагі нашай грамадзкасьці. Неабходна шырока разгарнуць загатоўку тавярнай прадукцыі, ліквідаваўшы разрыў паміж апрацоўкай і загатоўкай.

Ня менш 70 проц. пляну лёназагатовак да 10 сьнежня — вось асноўны лёзунг, пад якім павінны праходзіць загатоўкі.

К. І.

Бабруйшчына ганебна адстае

Бабруйск. (Наш кар.) Загатоўкі лёнавалакна па раёне праходзяць надзвычайна марудна. Сельсаветы раёну фактычна не ўзяліся яшчэ за гэтую справу. З 28 сельсаветаў раёну толькі адзін Кавалеўскі выканаў заданьне па лёназагатоўках на 52 проц. Рад сельсаветаў, як, напрыклад, Рымавіцкі, Падрэцкі, Паўлавіцкі, Продзьвінскі і Гарбацэвіцкі яшчэ не прыступілі да апрацоўкі лёну.

Праўленьні калгасаў апартуністычна недаацэньваюць значэньня своячасовай здачы лёну дзяржаве. Некатарыя калгасы праяўляюць кулацкія тэндэнцыі разьмеркаваньня лёну паміж калгасьнікамі; ёсьць выпадкі, калі лён разьмяркоўваюць трастою.

Недастаткова наладжана барацьба за якасьць валакна. Часта лён здаецца нятрэпаным, нязьвязаным, вельмі засмечаным трастою.

У выніку гэтага плян па лёназагатоўках выкананы на раёне толькі на 19 проц. Апроч таго, частка валакна затрымліваецца на глыбіных пунктах, несвачасова здаецца на базу райспажыўсаюзу.

Загатоўчыя арганізацыі на месцах не падрыхтаваліся як сьлед да прыёмкі лёну, сярод калгасьнікаў не вядзецца належнай арганізацыйнай работы аб здачы валакна дзяржаве. Толькі адзін калгас імя Дзяржынскага да гэтага часу поўнасьцю выканаў свае абавязкі перад дзяржавай на здачы лёну.

Мясячнік па загатоўцы лёну, абвешчаны ЦК КП(б)Б, павінен даць рашучы пералом у галіне загатовак. Гэтая справа павінна быць пастаўлена ў цэнтры ўвагі ўсіх партыйных, савецкіх і загатоўчых арганізацый раёну. Неабходна забясьпечыць поўнае выкананьне плянаў лёназагатовак на працягу абвешчанага месячніка.

А. Дамброўскі.

У першых радох барацьбы за лён.

Сянно. Кагас „Гарадзея", Гарывецкага сельсавету, першым уключыўся ва ўсебеларускі конкурс на лепшую апрацоўку лёну і здачы дзяржаве таварнай прадукцыі. Апроч таго, калгас уключыўся ва Ўсесаюзны конкурс, абвешчаны газэтай „Правда" на лепшае гаспадарча-оргавізацыйнае ўмацаваньне калгасаў.

Калгас па-баявому прыступіў да апрацоўкі лёну. Да 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі калгас здаў дзяржаве адну тону лёнавалакна і 26 цэнт. семя.

Уся работа па апрацоўцы лёну пераведзена на дзьве зьмены. Паміж паасобнымі брыгадамі заключаны сацымовы на хутчэйшае сканчэньне работы.

Да 1-га сьнежня г. г. калгас мяркуе поўнасьцю закончыць апрацоўку лёну

Б. Зяневіч.

Лён гніе, а лёнамялкі не скарыстоўваюцца.

Талочын. Па Круглянскім сельсавеце ў выніку поўнай безгаспадарчасьці, да апошняга часу засталася на полі непаднятай вялікая колькасьць трасты. Лён пачаў гнісьці.

У калгасе „Вална" на вачох сельсавету ляжыць разасланым ураджай з 50 га лёну. У калгасах „Новыя Шупяні", імя Варашылава, „Чырвоны Земляроб", „Беларуская Вёска" і інш. разасланы лён цалкам не падняты. Ёсьць пагроза недавыкананьня пляну лёназагатовак па сельсавеце.

Справа арганізацыі першапачатковай апрацоўкі лёну пастаўлена вельмі дрэнна. Непадрыхтаваны еўні для сушкі трасты, няма апалу. Наглядаюцца агідныя адносіны да скарыстаньня лёнамялак. У калгасе „Васільки" стаяць без работы чатыры мэханічныя лёнамялкі, у той час, калі побач у калгасе „Шупені" лён прыходзіцца мяць на драўляных „мяліцах".

М. Сымонаў.

З лістоў рабселькораў

Студэнты Лепельскага белпэдтэхнікуму каапэрацыяй зусім не забясьпечваюцца. Прамтаграфу студэнты не атрымліваюць. Праўда, прысылалі раз у сельпо абутак, але ён аказаўся малых разьмераў, у той час, калі ў школы Латыгаліцкага, Вароньскага і Стайскага сельсаветаў прысылалі абутак, у якім вучні хаваюцца з галавой. Ня лепш справа і з харчаваньнем.

Патрэбна спыніць шкодніцкія і пядбайныя адносіны да вучняў.

Жукаў М., Мухаў Х.

Вучні культтэхнікуму (Смалявіцкі раён) работаюць і жывуць у вельмі дрэнных умовах. У інтэрнатах адсутнічае самае неабходнае абсталяваньне—няма коек, умывальнікаў і нават кубкаў для піцьця.

Яшчэ горш абстаіць справа са сталоўкай. Харчаваньне вучняў дрэннае. Адміністрацыя тэхнікуму ня прымае ніякіх захадаў да зьлічэньня гэтых недахопаў.

Студэнты.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Да ўсебеларускага зьезду жанчын калгасьніц

На 25 лістапада Калгасцэнтрам склікаецца ўсебеларускі зьезд жанчын-калгасьніц. Гэта будзе першы зьезд жанчын калгасьніц.

Сярод вялікай армі калгасьнікаў улічыўшыся ў нашы калгасы за апошнія два гады, маюцца сотні тысяч жанчын-калгасьніц, якія адыгрываюць вялікую ролю ў калгасным будаўніцтве.

Зьезд калгасьніц павінен паставіць перад сабой задачу яшчэ большага згуртаваньня ўсёй масы калгасьніц вакол задач калгаснага будаўніцтва. Тут у першую чаргу перад намі высуваецца адна з галоўнейшых важнейшых задач—задача арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Пытаньні зьдзельнічыны і ўліку працы, сацпаборніцтва і ўдарніцтва—вось ас поўныя зьзеньні, якія павінны заняць цэнтральнае месца зьезду.

Практыка работы ў калгасах, асабліва за апошні год, паказала, што калгасьніцы часта працуюць інтэнсыўней нават за калгасьнікаў. Мы маем сярод калгасьніц не малую колькасьць лепшых перадавых ударніц, якія паказваюць лепшыя прыклады ў рабоце, задаюць тон у працы, праяўляюць асаблівую адданасьць справе калгаснага будаўніцтва.

Вопыты работы лепшых калгасьніц мы павінны перадаць усім калгасьніцам. Гэтакіх адданых калгасьніц мы маем у жывёлагадоўчых, льнаводных і іншых калгасах. Работу лепшых перадавых калгасьніц трэба ацаніць належным чынам. Гэтага дабіцца можна толькі пры правільным укараненьні зьдзельнічыны ў калгасах на аснове правільнага ўліку працы калгасьніц.

Вакол пытаньняў зьдзельнічыны і ўліку працы калгасьнікаў, калгасьніц, мы павінны праз зьезд калгасьніц мабілізаваць усю масу калгасьніц.

Разьмеркаваньне ўраджаю і калгасных даходаў праходзіць у раёнах вельмі марудна. Больш таго ў многіх калгасах панурае кулацкая ўраўнялаўка,—дзялежка ўраджаю па едаках. «Усе калгасы аднолькавы,—агітуе кулак, а таму і ўраджай і ўсе калгасныя прыбыткі—трэба дзяліць па роўнуэ. Падкулачнікі, дэдыры, культаі—зараз-жа падхапляюць гэты кулацкі лёзунг і пачынаецца дзялёжка па душах. Хто-ж ад гэтакай кулацкай дзялёжкі церпіць страту? Зразумела, што лепшыя калгасьнікі і калгасьніцы, якія добраасумленна і па ўдарнаму працавалі, а ў выніку атрымліваюць стольні, колькі і той, што гультяваў.

Па пытаньнях разьмеркаваньня ўраджаю і калгасных прыбыткаў трэба сканцэнтраваць увагу зьезду калгасьніц з тым, каб праз гэты зьезд дабіцца правільнага правядзеньня гэтага разьмеркаваньня ва ўсіх нашых калгасах.

У справе ажыцьцяўленьня задач, якія высунуты перад намі партыяй і ўрадам у галіне разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі, калгасьніца павінна адыгрываць вялікую ролю. Такім задачамі зьяўляюцца: камплектаваньне малочных, сьвіньнёй, птушкаводных таварных фермаў, догляд за каровай, сьвіньнёй, птушкай, пазялёненьне таварнасьці калгаснай гаспадаркі.

Важнейшай задачай барацьбы за завяршэньне пабудовы фундамэнту сацыялістычнай эканомікі ў нашай рэспубліцы—зьяўляецца задача барацьбы за тэхкультуры. У справе ўборкі, церабленьня, мочкі, сушкі і мяцьця лёну, наша калгасьніца займае першае месца. Справа першапачатковай апрацоўкі лёну і своячасовай здачы яго (прадажы) поўнасьцю дзяржаве, залежыць галоўным чынам ад калгасьніц, ад іх актыўнасьці і ініцыятыўнасьці іхняй працы. Калі мы сёлета пасьляхова ўбралі ў нашых калгасах 107 тыс. га лёну і 12 тыс. га канапель, дык у гэтым вельмі вялікую ролю адыгралі калгасьніцы. Яны-ж павінны адыграць гэтакую-ж ролю ў справе пераапрацоўкі гэтага лёну і канапель, своячасовай здачы (прадажы) дзяржаве.

Зьезд павінен будзе сканцэнтраваць усю ўвагу калгасьніц вакол задач барацьбы за тэхкультуры, барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў.

Калмык.

Для чаго патрэбна хлусьня аб дапамозе СССР генэралу Ма

БЭЙПІН. 18-XI. З Харбіну паведамляюць: «Супрацоўнік лёндаінскай газэты «Дэйлі мэйл», які знаходзіцца тут, паведаў японскага консула ў Харбіне, якога прасіў даць абвяржэньне праз японскія тэлеграфныя агенцтвы наконт прыпісаньня яму газэтай «Харбинское время» інтэрв'ю, у якім нібыта заявіў, што сам ён бачыў, як савецкая вайсковая улада наглядала за адпраўкай цягніка з знарадамі для генэрала Ма.

Карэспандэнт заявіў, што падобнага інтэрв'ю ён ніколі не даваў і ніколі ня бачыў ніводнага савецкага салдата ў войску Ма. «Я,—заявіў ка-

«ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» Пачатак а 6, 8-20, 10-30 каса а 4 г.	Гукавы фільм **Златыя горы** ў 8 частках
КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА Пач. а 7 8 45, 10-30. Каса ад 5 г.	Замежны фільм **У сьвеце плянэт і зорак** Звышпрадукцыя **Часопіс Саюзкіно № 63**
КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ Пач. 3-30, 6, 7-30, 9 і 10-30 Каса ад 12 г.	Застарэлі фільм **Невольніцы Бледнай гары** Звышпрадукцыя АПОШНІ ШЛЯХ (па аванье тэр. Капчэўскага)
КІНО ГРАЛЕТАРЫ Пачатак а 2 гадз	**Маставкі баявік** **Гандляры слязы**

АБ'ЯВА АБ РЭГІСТРАЦЫІ

11-га лістапада 1931 г. Народным Камісарыятам Фінансаў БССР, на падставе артыкулу 2-4 палажэньня аб дзяржаўнай рэгістрацыі ад 9-га лютага 1931 г. (Збор Законаў і Загадаў СССР № 8, паст. 99),

ЗАРЭГІСТРАВАНА Ў РЭЕСТРЫ ЮРЫДЫЧНЫХ АСОБ за № 92

наступнае аб'яднаньне, арганізаванае пры Белкаапсаюзе

Усебеларускае Гандлёвае Аб'яднаньне

ПА АПТОВЫМ ГАНДЛІ ГАСПАДАРЧЫМІ ТАВАРАМІ

МЕСЦА ЗНАХОДЖАНЬНЯ АБ'ЯДНАНЬНЯ, САВЕЦКАЯ, 43-13

Абавязковая пастанова № 40

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

Аб зьбіраньні і скарыстаньні ўсіх гараўзкіх адкідаў, дрэўлянага попелу, рознага сьмецьця, зазалак з памыйных ям, адкідаў з боень, адкідаў з прамысловых прадпрыемстваў, фэкальных вод, гною ад усіх двароў свойскай жывёлы і птушкі патрэбных для плянавага забясьпечаньня ўгнаеньнем прыгарадных саўгасаў і калгасаў, Менскі Гарадзкі Савет ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць усе дзяржаўныя ўстановы, прадпрыемствы, вайсковыя часткі, каапэрацыўныя, грамадзкія арганізацыі, жакты і прыватныя дамаўладальні вясьці сыстэматычнае зьбіраньне і захоўваньне ўсіх паказаных адкідаў:

Увага: Попел павінен зьбірацца і захоўвацца ў сухім нязмочным відзе, без шкла і розных матэрыялаў адкідаў. Для папярэджаньня магчымасьці пажару—попел зьбіраць у асцыжаным відзе ў скрынках, або бачонках з пакрыўкай з сяродзіны бляхаю.

2. Сабраны попел як і ўсе паказаныя віды адкідаў рэгулярна здаваць бясплатна прымацаваным саўгасам і калгасам.

Увага 1. Жыльлёвай каапэрацыі (жактам), а таксама і дамакарыстальні ам маюцца ўласныя агароды і сады дазваляецца з агульнай колькасьці сабраных імі адкідаў застаўляць патрэбную колькасьць для ўгнаеньня ўласных агародаў і садоў, ня звыш норм і сапраўдных патрэбаў сям'і.

Увага 2. Асобову вывазіць адкіды ўласным інспэктам на палі прымацаваных саўгасаў і калгасаў выключна на тыя месцы, якія будуць указаны апошнімі.

Увага 3. Дастаўка ўсіх астатніх адкідаў павінна праводзіцца прымацаванымі саўгасамі і калгасамі на іх сродкі.

Увага 4. Абавязаць Белсел гасаб'яднаньне, Белсаўзяржтраст, Кантору Сьвіньвод, Райкалгасаюз, МТС, замацаваныя за імі аб'екты, згодна размеркаваньня Гарвыканкаму, у 3-хдзённы тэрмін размяркаваць на сваім саўгасам, калгасам рэзерваны вышэй вышэй сказаны адкідаў і систэматычную вывазку, устанавіў пікладна колькасны вучот.

3. Адказваць па практычным ажыцьцяўленьні на зьбіраньні і вопыту ўсіх відаў ўгнаеньняў і адкідаў ускласьці:

а) Па дзяржаўных установах, прамысловых, каапэрацыйных і грамадзкіх арганізацыях на адміністрацыю апошніх.

б) Па асабозу—на адміністрацыю асабозу.

в) Па жакта —на праўленьні жактаў.

г) Па прыватных дамаўладаньнях, на дамаўладальнікаў.

д) Па вайсковых частках—на гаспадарчыя аддзелы вайсковых частак.

е) Адказваць па сваіх сувай і поўнай вывазцы ўсіх відаў адкідаў, ускладаецца на кіраўнікоў с-г арганізацый, Белсаўзяргаспадарання, Белсаўзяржтрэсту, Канторы Сьвіньвод, Райкалгасаюзу, МТС і дырэктароў сьледчых станцый.

4. Пікі выкананьня гэтай абавязковай пастановы ускладаецца на міліцыю.

5. За парушэньні выкананьня гэтай абавязковай пастановы прыцягваць у адміністрацыйным парадку штрафу да 100 рублёў, а ў прымусовым работам да 1 месяца.

6. Гэтая абавязковая пастанова ўвыходзіць у моц пасьля яе апублікаваньня.

Старшыня Менскага Гарадзкога Савету ВАЛОДЗЬКА.

Сэкратар ШАЛКАВЕЦ.

У мэтах у арадкаваньня будаўніцтва на 1932 г. МЕНКАМГАС АБВЯШЧАЕ:

1. Усе дазволы атрыманыя на вучасткі для будаўніцтва ў 1931 г. і на іншых будаўніцтва вызначаных аб'ектаў не расчачаты, анулююцца.

2. Усе арганізацыі і прыватныя асобы, якія мяркуюць будаваць у 1932 г. павінны даць заяўкі Камгасу на атрыманьне вучасткаў пад будаўніцтва не пазьней 1-XII бягучага году.

УВАГА: Пры запуны на адвод вучасткаў неабходна прадставіць наступныя дакумэнты:

а) Давядку адпаведных арганізацый аб уключэньні гэтага аб'екту будаўніцтва ў плян 1932 г.

б) Рэд будаўніцтва прамысловага, жыльлёвага і іншы характар будаўніцтва: камен., дрэвян., стандартн., культурн., а пры жыльлёвым—колькасьць кв. тэр.

в) Схематычны плян будаўніцтва.

3. Кага врычна забараняецца як па ад'ездзевых вучастках для новага будаўніцтва, так і на старых займаных вучастках прадпрыемствамі і інш. установамі будаваць якія-небудзь пабудовы недазволеныя Камгасам.

4. Усе арганізацыі, якія па сваіх плянах работ трэба праводзіць раскопку маставых і ходнікаў у 1932 г., павінны падставіць у Камгас не пазьней 20 сьнежня 1931 г. свае праекты і каляндарны плян раскопак на ўгадзеньне і апрымаваньне дазволу.

5. Пасьля вышэй вызначаных тэрмінаў дазволы на раскопкі вуліц у сувязі з плянам упарадкаваньня вуліц давацца ня будуць.

Заг. Камгасу ПІНХАСІК.

НК Асьветы і Цэнтральны Савет Т-ва „Прэч Няпісьменнасьць"

СКЛІКАЮЦЬ МІЖРАЁННЫЯ КУСТАВЫЯ НАРАДЫ

— па наступных цэнтрах: —

1. Віцебск—29-XI-31 г.

Асьвейскі	2 месцы
Дрысенскі	3 „
Полацкі	3 „
Расонскі	2 „
Гарадоцкі	3 „
Сураскі	3 „
Лепельскі	3 „
Бешанковіцкі	3 „
Вышацкі	2 „
Сіроцінскі	2 „
Віцебскі	20 „

2. Ворша—25 XI-31 г.

Лепельскі	3 месцы
Чашніцкі	2 „
Сеньненскі	3 „
Крупскі	3 „
Талачынскі	3 „
Дубровенскі	4 „
Горацкі	2 „
Мсьціслаўскі	3 „
Багомльскі	3 „
Аршанскі	20 „

3. Магілеў—25-XI-31 г.

Бялыніцкі	2 месцы
Шклоўскі	3 „
Быхаўскі	3 „
Чавускі	3 „
Прапойскі	2 „
Чэрыкаўскі	3 „
Крычаўскі	4 „
Клімавіцкі	3 „
Касьцюковіцкі	3 „
Краснапольскі	3 „
Магілеў	20 „

4. Гомель—25-XI-31 г.

Рагачоў	2 месцы
Жлобін	4 „
Кармянскі	3 „
Чачэрскі	2 „
Веткаўскі	2 „
Буда-Кошал.	2 „
Церахаўскі	3 „
Рэчыцкі	4 „
Лоеўскі	3 „
Гомельскі	20 „

5. Мазыр—29-XI-31 г.

Жыткавіцкі	3 месцы
Петрыкаўскі	4 „
Тураўскі	2 „
Лельчыцкі	3 „
Ельскі	3 „
Наваўлянскі	2 „
Хойніцкі	2 „
Брагінскі	2 „
Камарынскі	3 „
Мазырскі	20 „

6. Бабруйск—29-XI-31 г.

Копыльскі	3 месцы
Слуцкі	2 „
Чырвона-Слабодзкі	3 „
Старобінскі	2 „
Любаньскі	3 „
Старадарожскі	2 „
Асі